Несмотря на эти во многом чисто "технические" погрешности, "Логика" – полезное и доступное учебное пособие для студентов вузов.

**А.С.Клевченя**

**Крымінальнае права Беларусі (закон, злачынства, адказнасць)**: Навучальны дапаможнік / А.У.Баркоў, І.А.Грунтоў, Т.І.Доўнар і інш.; Пад рэд. А.У.Баркова. Мн.: "Завігар", 1997. 288 с.

Аўтарскі калектыў кафедры крымінальнага права юрыдычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта пад кіраўніцтвам дацэнта А.У.Баркова ажыццявіў удалую спробу прадставіць найбольш фундаментальны раздзел Агульнай часткі крымінальнага права з улікам шматлікіх змяненняў і дапаўненняў, унесеных у Крымінальны кодэкс (КК) Рэспублікі Беларусь за апошнія гады.

У прадмове да кнігі справядліва адзначаецца, што гэта – першы навучальны дапаможнік па крымінальнаму праву Беларусі, выдадзены на беларускай мове. Не ўдаваючыся ў пытанне аб дакладнасці беларускай тэрміналогіі, ужытай аўтарамі для вызначэння шырокага кола крымінальна-прававых паняццяў, адзначу, што выкарыстоўванне некаторых тэрмінаў выклікае пытанні. Так, напрыклад, азначэнне "неабходнай абароны" праз паняцце "правамерная абарона" (с.141) наўрад ці ўдалае па прычыне таўталагічнасці.

Да добрых вартасцей работы трэба аднесці актыўнае выкарыстанне яе стваральнікамі міжнародна-прававых норм, канстытуцыйнага, грамадзянскага і іншых галін заканадаўства, якія маюць важнае значэнне для правільнага разумення і прымянення крымінальнага закона. Арыгінальным уяўляецца выкладанне матэрыялу, прысвечанага саставу злачынства, паняццю і формам крымінальнай адказнасці.

Прадумана пабудавана структура дапаможніка. Так, заслугоўвае адабрэння размяшчэнне главы "Крымінальная адказнасць" у канцы працы. Па традыцыі пытанні аб крымінальнай адказнасці разглядваліся ўслед за выкладаннем пытанняў аб паняцці, задачах і прынцыпах крымінальнага права, што абцяжарвала засваенне матэрыялу, дзе патрэбна веданне такіх паняццяў, як злачынства, састаў злачынства і інш. У дапаможніку аналіз крымінальнай адказнасці і форм яе рэалізацыі выцякае і будуецца на папярэднім матэрыяле. У працы знайшлі адлюстраванне вельмі складаныя пытанні множнасці злачынстваў, вылучаныя ў самастойную главу.

Не можа не выклікаць цікавасці кароткі нарыс гісторыі крымінальнага права рэспублікі і, асабліва, раздзел з адметнай навізною, прысвечаны гісторыі крымінальнага права феадальнай Беларусі. Сцісла і ўзважана выкладзена гісторыя беларускага крымінальнага права 90-х гадоў.

Аўтары дапаможніка нярэдка адмаўляюцца ад асвятлення праблемных пытанняў, хаця ў шэрагу выпадкаў трэба было б паказаць вядомае несупадзенне паміж пастулатамі навукі крымінальнага права і практычнай іх рэалізацыяй. Так, у прыватнасці, патрэбна было б звярнуць увагу на недапушчальнасць аналогіі пры азначэнні злачыннасці дзеяння (с.11), адзначыўшы адначасова, што яна ўсё ж такі мае месца ў правапрымяненні (гл., напрыклад, пастанову пленума Вярхоўнага суда РБ // Судовы веснік. 1995. №1. С.8. П.4).

Вельмі катэгарычным уяўляецца сцвярджэнне аб тым, што тлумачэнне крымінальнага закона, які знаходзіцца ў пастановах пленума Вярхоўнага суда рэспублікі, з'яўляецца абавязковым для ўсіх судоў, іншых органаў і асоб пры прымяненні імі гэтага закона (с.38). Такое абагульненне, як нам уяўляецца, зроблена на падставе аналізу судовай практыкі, да сённяшняй пары заканадаўча не зацверджанай, і не больш таго.

Пры характарыстыцы ўзаемасувязі крымінальнага і адміністрацыйнага права ў дапаможніку апускаецца разгляд прынцыпова важнага для крымінальнага заканадаўства Беларусі пытання пра спалучанасць крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці ў нормах з адміністрацыйнай прэюдыцыяй. Толькі ў адным месцы (с.47) упамінаецца аб адміністрацыйнай прэюдыцыі, праўда, без прымянення гэтага тэрміна для абазначэння дробнага крадзяжу маёмасці. Да таго ж размежаванне злачынства і адміністрацыйнага правапарушэння ажыццяўляецца з пазіцыі аднясення прэюдыцыі да адзнак аб'ектыўнага боку злачынства, тады як яна – адзнака суб'екта злачынства.

Аналізуючы прававыя вынікі прычынення шкоды пры выкананні загаду (с.157–158), аўтары чамусьці замоўчваюць палажэнні арт.226 КК, які дастаткова дакладна рэгламентуе пытанні адказнасці начальніка і падначаленага ў сувязі з выказаннем загаду. Упамінанне ў дапаможніку пра наяўнасць названага артыкула ў Кодэксе важна таму, што ў Агульнай частцы дзеючага КК названая акалічнасць, якая выключае злачыннасць дзеяння, увогуле не прадугледжана.

У азначэнне паняцця "крымінальная адказнасць" цалкам абгрунтавана ўключаны такія элементы, як асуджэнне ад імя дзяржавы па прыгавору суда асобы, якая здзейсніла злачынства, і прымяненне да такой асобы (асуджанай) мер пакарання, а таксама іншых мер уздзеяння ў адпаведнасці з крымінальным законам (с.228). Аднак выкарыстанне ў дадзеным азначэнні злучніка "і" наўрад ці да месца, бо крымінальная адказнасць можа быць рэалізаванай, у прыватнасці, і ў форме асуджэння, але без назначэння пакарання (ч.2 арт.48 КК, ч. 2, арт.311 КПК).

Выказаныя заўвагі ні ў якім разе не прымяншаюць добрай якасці названага навучальнага дапаможніка. Ён, несумненна, будзе карысным не толькі студэнтам-юрыстам, але і ўсім, хто цікавіцца праблемамі айчыннай навукі крымінальнага права.

**А.І.Лукашоў**

А.Н.Данилов. **Переходное общество: проблемы системной трансформации**. Мн.: "Універсітэцкае", 1997. 431 с.

Из всего многообразия насущных социологических проблем автор выбрал для исследования, пожалуй, наиболее актуальную: обратился к процессам, начало которым положил распад Советского Союза, историческое событие такого же размаха и значения для всеобщей истории, который имела, пожалуй, только гибель Римской империи. Сегодня это практически еще не осознается. Не осознаются в полной мере и исторические последствия трансформации, которая была задумана прежде всего как средство закрепления победы над Советским Союзом, развивавшим самостоятельный вариант цивилизационной модели, но по ряду известных обстоятельств не сумевшим обеспечить его жизнеспособность.